Разьдзел 1

# РЭЖЫМ ЛУКАШЭНКІ ПАМІЖ ДЗЬВЮМА ВЫБАРЧЫМІ КАМПАНІЯМІ: ВОНКАВЫЯ І ЎНУТРАНЫЯ ФАКТАРЫ (ДЭ)ЛЕГІТЫМІЗАЦЫІ

Прэзыдэнцкія выбары, што адбыліся ў Беларусі 9 верасьня 2001 году, скончыліся перамогай дзеючага прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі. Дарма што гэтую палітычную кампанію было б больш правільна ахарактарызаваць як сілавую гульню з загадзя вызначаным вынікам, абвешчаная ўладамі перамога прэзыдэнта Лукашэнкі ня выклікала актыўных пратэстаў ані з боку апазыцыі, ані з боку міжнароднай супольнасьці. Асноўным апанэнтам Лукашэнкі быў кандыдат ад "шырокай грамадзянскай кааліцыі" (эфэмэрнае аб'яднаньне апазыцыйных палітычных партыяў і рухаў з тымі прадстаўнікамі беларускай намэнклятуры, якіх Лукашэнка пазбавіў пасадаў), старшыня Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларускай Уладзімер Ганчарык. Паводле афіцыйных зьвестак, у выбарах узялі ўдзел каля 82% выбарцаў. Паводле гэтых жа звестак, Лукашэнка атрымаў пераканаўчую перамогу з вынікам 75,65% галасоў супраць 15,65% за Ганчарыка. Апазыцыя спрабавала выставіць пратэст, заявіўшы аб перавазе Лукашэнкі ўсяго ў шэсць адсоткаў (46% супраць 40%), і патрабавала другога туру. Паколькі незалежнае назіраньне ня здолела прывесьці праўдзівых дадзеных, адзіным спосабам праверкі заяваў абодвух бакоў могуць быць толькі дадзеныя незалежных апытаньняў да і пасьля выбараў. Яны паказваюць, што за дзень да галасаваньня Лукашэнка меў падтрымку 46,8% усіх вы-



барцаў, а Ганчарык — 26%. Пры ўмове, што прагаласавалі 82%, гэта дае 56% галасоў за Лукашэнку і 33% — за Ганчарыка. Нягледзячы на заявы перадвыбарнага штабу Ганчарыка, прайгранка была відавочная нават для заўзятых прыхільнікаў апазыцыі, і пратэсты зьберлі толькі некалькі тысячаў чалавек.

**Табліца: Прагноз прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году ў Беларусі, %**

| | 8 ліпеня | 16 ліпеня | 24 ліпеня | 1 жніўня | 9 жніўня | 16 жніўня | 25 жніўня | 31 жніўня | 8 верасьня | Афіцыйныя вынікі* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Дадзеныя апытаньняў НІСЭПД, % | | | | | | | | | | |
| Лукашэнка | 40.6 | 40.7 | 42.3 | 43.3 | 44.4 | 43.6 | 44 | 49.7 | 46.8 | 63.4 |
| Ганчарык | 3.4 | 4.2 | 4.8 | 8.4 | 13.7 | 21.1 | 20.3 | 23.2 | 27.8 | 13.1 |
| Праекцыя пры яўцы ў 83.86% ** | | | | | | | | | | |
| Лукашэнка | 48.4 | 48.5 | 50.4 | 51.6 | 52.9 | 52.0 | 52.5 | 59.3 | 55.8 | 75.65 |
| Ганчарык | 4.1 | 5.0 | 5.7 | 10.0 | 16.3 | 25.2 | 24.2 | 27.7 | 33.2 | 15.65 |

* Афіцыйныя зьвесткі Цэнтравыбаркама і праекцыя на падставе дадзеных па яўцы;
**Лічба яўкі, што была афіцыйна пададзеная Цэнтравыбаркамам.

Як бачна з табліцы, прыблізна адна шостая частка галасоў усіх выбарцаў (ці каля адной пятай ад галасоў тых, хто прыйшоў на выбары) была "пераразьмеркаваная" выбарчымі камісіямі, што сьведчыць аб надзвычай вялікім адсотку фальсыфікацый падчас галасаваньня. Аднак дадзеныя незалежных апытаньняў пацьвердзілі факт перамогі Лукашэнкі, хай і са значна меншым разрывам. Зь іншага боку, разгром сеткі незалежных назіральнікаў і зрыў апытаньняў выбарцаў па мэтадзе exit poll не дазволілі падаць рэальных альтэрнатыўных вынікаў галасаваньня (больш за тое, на наступны дзень пасьля галасаваньня кіраўнікі незалежных арганізацыяў па назіраньні за выбарамі адмежаваліся ад заяваў апазыцыі аб тым, што насамрэч Ганчарык прайграў Лукашэнку толькі некалькі адсоткаў галасоў). І нарэшце, паплечнікі апазыцыйнага кандыдата аказаліся няздольнымі да абароны вынікаў выбараў, што, у сваю чаргу, ускосна сьведчыла аб апатычнасьці і нізкім мабілізацыйным патэнцыяле дэмакратычнага электарату, а таксама аб тым, што

абвешчаная перамога дзеючага прэзыдэнта не была ўспрынятая грамадзтвам як "скрадзеныя выбары".

**Ці заўважылі выбарцы парушэньне закону?**

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Ніякіх парушэньняў закону цягам выбараў не было | 32.7 |
| Цягам выбараў былі масавыя парушэньні закону | 21.0 |
| Цягам выбараў былі нязначныя парушэньні, якія не паўплывалі на канчатковы вынік | 18.6 |
| Цяжка сказаць/няма адказу | 27.7 |

Крыніца: НІСЭПД.

Вынікі выбараў у пэўнай ступені пярэчылі стану беларускага грамадзтва, якое з усё большай прыхільнасьцю ставілася да ідэі палітычных пераменаў і зьмены пануючай сыстэмы. Паводле зьвестак незалежных сацыёлягаў, за некалькі месяцаў да выбараў адносная бальшыня выбарцаў (54%) была гатовыя падтрымаць кандыдата, чыя праграма абяцала б кардынальны паварот ад палітыкі Лукашэнкі, супраць 40%, якія выступалі за палітыку Лукашэнкі. Відавочна, што растлумачыць разгром апазыцыі адсутнасьцю электаральных рэсурсаў для беларускай дэмакратыі немагчыма. Падчас кампаніі Лукашэнка толькі нязначна павялічыў свой электарат: "скочыўшы вышэй за галаву", ён атрымаў 46% ад усяго грамадзтва. Апазыцыя, тым часам, мусіла цягам усёй кампаніі кансалідаваць свой базавы электарат. І хоць фактычна яна пашырыла кола сваіх прыхільнікаў амаль утрая (з 9% да 26% ад усяго грамадзтва) ці, калі казаць выключна пра Ганчарыка, нават у трынаццаць разоў (з 2 да 26%), але ўсё адно, гэта было менш за палову таго электарату, які да выбару выступаў за перамены. Фактары, што не дазволілі апазыцыі ў поўнай ступені рэалізаваць уласны патэнцыял, будуць разгледжаныя далей. Пакуль што адзначым, што адсутнасьць эфэктыўнай палітычнай альтэрнатывы лукашэнкаўскаму рэжыму, часткова вынішчанай яе рэпрэсіўным апаратам, а часткова падарванай уласнымі непрафэсійнымі дзеяньнямі, выклікала пачуцьцё разгубленасьці сярод тых, хто на працягу пяцёх гадоў зьвязваў надзеі на палітычныя перамены ў Беларусі з унутранай палітычнай апазыцыяй.

Гэтым выбары'2001 адрозьніваліся, напрыклад, ад рэфэрэндуму 1996 году, які лукашэнкаўскі рэжым правёў прыкладна па тых самых правілах (бязьмежнае карыстаньне адміністрацыйнымі рэсурсамі, манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі, перасьлед і запалохваньне апазыцыі, злоўжываньне датэрміновым галасаваньнем, нарэшце, паводле незалежных назіральнікаў, масавая фальсыфікацыя вынікаў). Тады ўвядзеньне новай канстытуцыі, што фармальна ўсталёўвала ў краіне аўтарытарную сыстэму ўлады, прывяло да міжнароднай ізаляцыі лукашэнкаўскага рэжыму, спыненьні сяброўства ў Радзе Эўропы і замарожваньня кантактаў афіцыйнага Менску з Эўразьвязам і Злучанымі Штатамі. Заходняя супольнасьць уступіла ў пэрыяд канфрантацыі зь беларускім рэжымам, у якой яна адкрыта выступала на баку ўнутранай апазыцыі. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў асноўныя заходнія гульцы, якія так ці інакш уплываюць на беларускую палітыку (Злучаныя Штаты, АБСЭ, Рада Эўропы, Эўразьвяз), вырашылі перагледзець свае стратэгіі ўзаемадзеяньня зь Беларусьсю выходзячы з факту, што лукашэнкаўскі рэжым здолеў захаваць сваю стабільнасьць, і спробы зьмяніць палітычную сытуацыю ў краіне мэтадам ціску звонку і ізаляцыі пацярпелі паразу. Пасіўнасьць замежных гульцоў нельга ў поўнай меры растлумачыць нават і трагічнымі падзеямі 11 верасьня ў Нью-Ёрку, якія, натуральна, пераключылі ўвагу ўсяго сьвету на змаганьне зь міжнародным тэрарызмам. Так, яшчэ 10 верасьня 2001 году місія АБСЭ падала вельмі стрыманую справаздачу аб выніках выбараў, нават прызнаўшы некаторы прагрэс у фармаваньні грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі і падкрэсьліўшы, што ізаляцыя краіны - тупіковы шлях у вырашэньні палітычных праблемаў, зьвязаных з пануючым рэжымам.

Гэта не азначала, што Лукашэнка быў прызнаны Захадам у якасьці дэмакратычна абранага лідэра. У той жа час, з боку заходніх актараў назіралася відавочная "стомленасьць" ад канфрантацыі з афіцыйным Менскам. Іх далейшыя дзеяньні так ці інакш выходзілі з рэальнага разьмеркаваньня ўлады і ўплыву ў краіне. Так, паралельныя інстытуты ўлады (як Вярхоўная Рада 13-га скліка領ньня), што існавалі ў падпольлі і чыя рэальная дзейнасьць ажыцьцяўлялася па-за межамі краінамі, страцілі свой уплыў на

замежных палітычных рынках. Замест гэтага, усё больш папулярнымі станавіліся ідэі "пакрокавай" стратэгіі (накшталт той, што была сфармуляваная Радай Эўропы пры канцы 2001 году), якія прадугледжвалі ўзаемадзеяньне з рэжымам у Менску пры ўмове, што той зробіць пэўныя крокі на шляху палітычнай лібэралізацыі. АБСЭ, чыя кансультацыйна-назіральная група была выціснутая з краіны цягам 2001-2002 гадоў, мусіла ісьці на саступкі, каб аднавіць сваю дзейнасьць у краіне (вынікам чаго стала аднаўленьне Нацыянальнага Сходу РБ у якасьці ўдзельніка яе Парлямэнцкай Асамблеі). Што да Злучаных Штатаў, то Беларусь, безумоўна, адышла на задні плян у іх замежнай палітыцы пасьля падзеяў у Аўганістане ды Іраку. Да таго ж, крах спробы зьдзейсьніць югаслаўскі сцэнар у Беларусі прывёў да неабходнасьці пераасэнсаваньня тактыкі ўзьдзеяньня на сытуацыю ў краіне, што дагэтуль не завершылася выпрацоўкай нейкай адмысловай стратэгіі — таму амэрыканскі ўплыў на беларускую палітыку ў 2002 годзе значна зьнізіўся. Пэўная разгубленасьць заходнікаў у значнай ступені спрыяла і аслабленьню ўнутранай апазыцыі.

## Легітымізацыя Лукашэнкі?

Ці прывяла перамога Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах да легітымізацыі яго палітычнага рэжыму і ці паспрыяла мацаваньню яго пазыцыяў на ўнутраным і замежным палітычных рынках? Каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба спачатку вызначыць, што азначае сам тэрмін "легітымнасьць" і наколькі стабільнасьць палітычнага рэжыму залежала ад яго легітымнасьці ўнутры краіны і звонку.

У беларускім палітычным дыскурсе пад тэрмінам "легітымнасьць улады" часьцей за ўсё разумеюць адпаведнасьць дэмакратычным стандартам мэханізмаў і сродкаў, якімі яна ажыцьцяўляецца. З гэтага пункту гледжаньня, легітымнасьць Лукашэнкі (пасьля падзеяў у лістападзе 1996 году і асабліва пачынаючы з 21 ліпеня 1999 году, калі скончыўся яго першы пяцігадовы тэрмін прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў) аспрэчвалася ўнутранай апазыцыяй, што не прызнала афіцыйна абвешчаных вынікаў лістападаўскага канстытуцыйнага рэфэрэндуму, захавала вернасьць Канстытуцыі 1994 году; і той часткай міжнароднай супольнасьці (Эўропа і Злучаныя Штаты), для якой адпаведнасьць працэсаў рэкрутаваньня і функцыянаваньня ўраду ці ўладара стандартам дэмакратыі і правоў чалавека ёсьць галоўным чыньнікам, паводле якога прызнаецца ці адхіляецца легітымнасьць іх прэтэнзіяў на панаваньне. Стаўленьне гэтых палітычных суб'ектаў да лукашэнкаўскай улады не зьмянілася пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. Больш за тое, акурат выбары дадалі новых аргумэнтаў апанэнтам беларускага лідэра для абвінавачаньняў у недэмакратычнасьці існага палітычнага рэжыму. З гэтай нагоды, было б недарэчна казаць аб вонкавай легітымізацыі Лукашэнкі пасьля верасьнёўскай кампаніі (іншай зьявай стала вышэйадзначаная стомленасьць ад канфрантацыі з Лукашэнкам, якая насамрэч прымушала замежных актараў да пошуку кантактаў з афіцыйным Менскам). Да таго ж нельга казаць і пра нейкія замежнапалітычныя дывідэнды, якія маглі атрымаць за гэты час беларускія ўлады. Ім насамрэч не ўдалося дасягнуць прагрэсу ў паляпшэньні стасункаў з асноўнымі вонкавымі актарамі, такімі, як Злучаныя Штаты, Эўразьвяз ці Рада Эўропы. Выбухлы ў лістападзе 2002 году скандал з нагоды нявыдачы ўезнай візы Лукашэнку для ўдзелу ў паседжаньні Рады праграмы NATO "Партнэрства дзеля міру" толькі падкрэсьліў, што міжнародная ізаляцыя Беларусі ўзмацняецца. Выняткам можна лічыць толькі наданьне Нацыянальнаму Сходу месца ў Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ ў лютым 2003 году. Але і гэты крок можна трактаваць як выключна тэхнічны з той нагоды, што сябрамі гэтага інстытуту ёсьць парлямэнты яшчэ менш дэмакратычнгых краінаў (такіх, як Узбэкістан ці Туркмэністан), што ня сьведчыць аб міжнародным прызнаньні іх палітычных рэжымаў як дэмакратычных*.

Унутраную ж легітымнасьць лукашэнкаўскага рэжыму трэба



* З гэтай трактоўкай, аднак, могуць не пагадзіцца тыя прадстаўнікі беларускай апазыцыі, якія палічылі запрашэньне Нацыянальнага Сходу ў ПА АБСЭ як крок да легітымізацыі рэжыму.

разглядаць найперш у сацыялягічным аспэкце: як "прызнаньне панаваньня з боку дзеючых суб'ектаў" ці, іншымі словамі, згода на падпарадкаваньне рэальна існым правілам гульні з боку насельніцтва дзяржавы.

Клясык сацыялёгіі Макс Вэбэр вызначыў тры асноўныя тыпы легітымізацыі ўлады. Пры першым тыпе - легальна-рацыянальным — грамадзяне сьвядома прымаюць уладу і правілы гульні, што яна навязвае, на аснове таго, што гэтыя правілы адпавядаюць іх уласным інтарэсам, а дзеяньні ўлады адпавядаюць іх уяўленьням аб праве і прызнаюцца законнымі. Гэты тып панаваньня характэрны для сучасных дэмакратычных грамадзтваў, дзе ўсталяваліся прынцыпы праўнай дзяржавы. Галоўным носьбітам улады зьяўляецца закон, а не асоба; грамадзянін не аддзяляе сябе ад дзяржавы, маючы правы на ўдзел у ёй і адпаведна прызнаючы сваю адказнасьць за яе дзеяньні. Другі тып - традыцыйны - забясьпечваецца "маральлю і звычкамі да пэўных паводзінаў". Традыцыйная ўлада грунтуецца на веры ў непахіснасьць і нават сьвятасьць існага ладу. Гэты тып панаваньня характэрны для традыцыйных, патрыманіяльных грамадзтваў, пабудаваных па прынцыпе "ўладар - суб'екты", у якіх, у адрозьненьне ад грамадзкіх супольнасьцяў, існуе жорсткае разьдзяленьне паміж падначаленымі масамі і ўладай, якая ўспрымаецца імі як канстанта, самадастатковае ўтварэньне, за дзеяньні якой яны не нясуць аніякай адказнасьці, аднак чыё існаваньне — безумоўная вартасьць. Нарэшце, трэці тып - харызматычны - трымаецца на псыхалягічнай прывязанасьці масаў да лідэра і адпаведна на ягонай здольнасьці выпрацаваць у падначаленых уяўленьне аб уласнай экстраардынарнасьці, аб сваей унікальнай місіі, ажыцьцявіць якую можа толькі ён.

Стратэгія ўнутранай арганізацыі лукашэнкаўскага рэжыму стане зразумелай, калі больш дакладна прааналізаваць мэханізмы яго функцыянаваньня, што склаліся цягам апошняга дзесяцігодзьдзя. З аднаго боку, яны маюць выразныя рысы султанізму, ці такога фэномэну, што грунтуецца на канцэнтрацыі фармальнай і нефармальнай улады ў руках адной асобы і нагадвае абсалютную манархію, не абавязкова пры наяўнасьці манархічных інстытутаў. Хуан



Лінц і Х. Э. Чэлабі апісваюць ідэальны тып султаніскага рэжыму як сыстэму ўлады, "… заснаваную на пэрсанальным панаваньні, пры якой ляяльнасьць да лідэра матывавана не ... артыкуляцыяй ідэалёгіі, не яго ўнікальнай пэрсанальнай місіяй, не яго харызматычнымі якасьцямі, але сумесьсю страху і ўзнагарод для падначаленых. Уладар ажыцьцяўляе ўладу без абмежаваньняў, па сваёй волі, кіруючыся перадусім традыцыямі ці павагай да ідэалёгіі ці сыстэмы вартасьцяў"[1].

Па азначэньні, сучасныя султаніскія рэжымы базуюцца на гвалце і неабмежаванай уладзе аднаго чалавека. Фэномэн легітымнасьці не ёсьць адметнай рысай такіх рэжымаў, паколькі яны як правіла ўсталёўваюцца ў грамадзтвах, што не перайшлі ў сваім разьвіцьці далей за традыцыйны стан, у якіх пастаноўка самога пытаньня аб "згодзе на панаваньне з боку паноўных" выглядае недарэчнай. Ува ўмовах немагчымасьці здабыць унутраную легітымнасьць, жыцьцяздольнасьць улады забясьпечваецца праз выпрацоўку кліенцкіх сувязяў з больш моцнай дзяржавай, чыя эліта і забясьпечвае выжываньне "султана". Лукашэнку часткова ўдалося пабудаваць такую сыстэму сувязяў з Расіяй, што і кампэнсавала адсутнасьць вонкавай легітымнасьці на заходніх палітычных рынках.

Аднак рэжым Аляксандра Лукашэнкі толькі часткова адпавядае гэтаму ідэальныму тыпу. Султаніскія элемэнты лукашэнкаўскай улады застаюцца значна абмежаванымі яго папуліскімі тэндэнцыямі, што выражаецца ў імкненьні захаваць высокі ўзровень грамадзкай падтрымкі як да асобы прэзыдэнта, так і да яго палітычнага рэжыму, бесьперапыннай апэляцыяй прэзыдэнта да масаў і маніпуляваньне базавымі элемэнтамі палітычнай культуры беларускага грамадзтва, яго імкненьнем вызначыць унікальную, не зусім важна якую, пэрсанальную місію (спачатку - аднаўленьне Савецкага Саюзу і барацьба з карупцыяй, потым - супрацьстаяньне NATO, апошнім часам - пабудова "моцнай і квітнеючай" Беларусі), забясьпечыць мінімальны ўзровень дабрабыту для як мага шырэйшага кола насельніцтва (эканамічны папулізм); а таксама яго харызматычнымі якасьцямі, што забясьпечваюць прыхільнасьць значнай часткі насельніцтва. Іншымі словамі, папулізм прымушае Лу-

кашэнку да забесьпячэньня квазідэмакратычнай легітымнасьці сваёй улады (дэмакратычнай, бо базуецца на сапраўднай падтрымцы значнай часткі насельніцтва; квазі - бо гэтая падтрымка мабілізуецца і выкарыстоўваецца з парушэньнем ці нават руйнаваньнем базавых працэдурных нормаў дэмакратыі).

Сумесь папулісцкіх і султаніcцкіх элемэнтаў у арганізацыі лукашэнкаўскага рэжыму спрыяла таму, што на пэўны час ён быў здольны забясьпечваць сваю ўнутраную легітымнасьць праз камбінацыю некалькіх стратэгіяў. Так, лукашэнкаўская ўлада не аспрэчвалася значнай часткай грамадзтва, што не была актыўным суб'ектам палітычнага працэсу, заставалася ў традыцыйным, патрыманіяльным стане і без асаблівых ваганьняў прымала той парадак рэчаў, што складаўся пад узьдзеяньнем вонкавых акалічнасьцяў. Гэтаксама даволі значная частка беларускага грамадзтва знаходзілася пад моцным уплывам Лукашэнкі як харызматычнага лідэра, верыла ў яго амаль што мэсіянскую ўнікальнасьць, ускладала на яго свае ўласныя надзеі і тым самым без ваганьняў пагаджалася як з самім фактам яго панаваньня, так і зь яго мэтадамі ажыцьцяўленьня ўлады. Паколькі гэтыя дзьве гэтыя сацыяльныя групы, якія нават шмат у чым перасякаліся, складалі ў свой час большыню грамадзтва, легітымнасьць лукашэнскаўскіх прэтэнзіяў на неабмежаваную ўладу аспрэчвалася толькі той яго часткай, што стварала жорсткі апазыцыйны электарат, чыё прадстаўніцтва ў палітычнай і грамадзянскай супольнасьці хутка аформілася як "паралельнае грамадзтва". Аднак гэтая частка беларускага грамадзтва не вызначалася высокай палітычнай актыўнасьцю і не была схільная да сыстэматычных пратэстных дзеяньняў, якія канцэнтраваліся пераважна ў сталіцы краіны і да таго ж не адрозьніваліся інтэнсіўнасьцю (пэрыядычныя выбухі — напрыклад вясной 1996 і 2000 гадоў — хутка пераходзілі ў палітычны застой, а паразы вулічных акцыяў спараджалі расчараваньне і апатыю ў шэрагах апазыцыйнага электарату).

Мацаваньню ўлады Лукашэнкі спрыяла тая акалічнасьць, што ён быў здольны надаць свайму рэжыму "квазідэмакратычную легітымнасьць" (ці, у вэбэраўскай тэрміналёгіі, рысы легальна-рацыянальнага панаваньня), які адпавядаў фармальнаму крытэру дэмакратычнай легітымнасьці (быў здольны здабыць для сябе сьвядомую падтрымку значнай часткі грамадзтва падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году і цягам значнага часу падтрымліваць яе на высокім узроўні), пры гэтым абсалютна не паважаючы працэдуры, празь якую гэтая падтрымка павінна быць здабыта ў дэмакратычнай сыстэме (адсюль і прыстаўка квазі). Арганізацыя і практыка функцыянаваньня лукашэнкаўскага рэжыму цалкам адпавядала ўяўленьням пра эфэктыўную і справядлівую ўладу, якія існавалі сярод той часткі беларускага насельніцтва, што складала прапрэзыдэнцкі электарат. Арыентаваны на "моцнага лідэра" і "жорсткую руку", ён падтрымліваў прэзыдэнта акурат за яго дыктатарскія схільнасьці. Да таго ж, у грамадзтве, дзе адсутнічаюць трывалыя дэмакратычныя вартасьці і грамадзянская палітычная культура, уяўленьні аб дэмакратыі ў найлепшым выпадку набываюць прымітыўную форму плебісцытарнай (дэлегаванай) дэмакратыі, у якой лідэру, аднойчы абранаму масамі, надаецца карт-блянш для наступных дзеяньняў. Такі лідэр кіруецца прынцыпам мэтазгоднасьці і ня зносіць абмежаваньня нейкімі правіламі гульні, канстытуцыйнымі нормамі ці павагай да індывідуальных правоў і свабодаў. Такое ўяўленьне аб дэмакратыі як неабмежаванай уладзе абранага народам лідэра шырока і інтэнсіўна насаджалася лукашэнкаўскім рэжымам у беларускім грамадзтве. І што цікава: яго значная частка згаджалася з такой дэфініцыяй (па дадзеных НІСЭПД з красавіка 2001 году, не менш як 19,6 % адсоткаў беларусаў лічыла палітычны рэжым у сваёй краіне дэмакратычным, а сярод пэнсіянэраў, якія былі базавым электаратам Лукашэнкі, гэтая лічба дасягала 31,3%; паказальна, што не згаджалася з гэтай фармулёўкай толькі 22,6 % пэнсіянэраў). Такім чынам, крытыка з боку ўласнай апазыцыі і міжнароднай супольнасьці, што акцэнтавала недэмакратычны характар лукашэнкаўскай улады, доўгі час не знаходзіла дастаткова шырокай сымпатызуючай аўдыторыі ўнутры краіны і дзеля гэтага не магла мець значных вынікаў.

Наступным чыньнікам, што спрыяў мацаваньню "квазідэмакратычнага" аспэкту ўнутранай легітымізацыі лукашэнкаўскай улады,

была адносная асэнсаванасьць падтрымкі Лукашэнкі яго электаратам. Насуперак пашыраным уяўленьням, што высокі рэйтынг беларускага прэзыдэнта ствараўся выключна маніпуляцыяй сродкамі масавай інфармацыі, "сьпіральлю маўчаньня" ды "фактарам страху", лукашэнкаўскі электарат досыць ясна ўсьведамляў не толькі каго, але і што ён падтрымлівае. Яго аснову стваралі тыя сацыяльныя слаі, чый дабрабыт знаходзіўся ў выключнай залежнасьці ад дзяржавы. Зьмяненьне яе сацыяльных функцыяў у выпадку буйнамаштабных (ці нават частковых) палітычных і эканамічных рэформаў аўтаматычна пераводзіла іх у катэгорыю "няўдачнікаў", "аўтсайдэраў" ці, папросту кажучы, выкідала на ўзбочыну жыцьця (сюды ў пэўнай ступені можна аднесьці пэнсіянэраў, калгасьнікаў і працаўнікоў буйных прамысловых прадпрыемстваў). Канечне, такое разьвіцьцё падзеяў было ў вялікай ступені гіпатэтычным, яно ўбівалася ў сьвядомасьць гэтых сацыяльных групаў дзяржаўнай прапагандай. Але, аб'ектыўна кажучы, да такой пазыцыі падштурхоўваў досьвед трансфармацыі ў рэгіёне, асабліва ў той яе частцы, дзе рэформы былі недастаткова пасьпяховымі. Менавіта гэты нэгатыў і распаўсюджваўся беларускімі ўладамі праз свае мэдыі. Досьвед пераходных эканомік паказаў, што падобны сцэнар для гэтых сацыяльных групаў ня быў цалкам малаверагодны. Больш за тое, Лукашэнка і яго палітыка пераразьмеркаваньня і максымальнага захаваньня старой сацыяльна-эканамічнай сыстэмы была для гэтых групаў пэўнай гарантыяй захаваньня звыклага ладу жыцьця, прадказальнасьці і стабільнасьці, што часам цанілася гэтымі групамі больш за высокі ўзровень жыцьця без гарантыяў яго захаваньня. Такім чынам, мацаваўся нефармальны "сацыяльны кантракт" паміж лідэрам і масамі, у рамках якога лаяльнасьць да пануючай улады абменьвалася на гарантыі фізычнага выжываньня для паноўных.

Безумоўна, якраз працэдура зьяўляецца найважнейшым чыньнікам у ацэнцы дэмакратычнасьці ўлады, праз што палітычны рэжым у Беларусі ня мог не лічыцца аўтарытарным, нягледзячы на свой высокі ўзровень грамадзкай падтрымкі. Але ж у адрозьненьне ад іншых антыдэмакратычных рэжымаў, яго трансфармацыя



немагчымая безь зьнікненьня яго "квазідэмакратычнай легітымнасьці". Іншымі словамі, аніводны варыянт зьмены палітычнага рэжыму ў Беларусі не ўяўляецца рэальным без папярэдняга "разводу" апошняга з уласнай сацыяльнай базай. Галоўным наступствам выбараў '2001 было тое, што пры любым варыянце падліку галасоў казаць аб такім "разводзе" было нельга. Гэта спрыяла пэўнай дэмабілізацыі і дэмаралізацыі яго апанэнтаў як у Беларусі так і за яе межамі, стварала ўражаньне непазьбежнасьці захаваньня існага палітычнага рэжыму ў яго старой форме, рабіла амаль немэтазгоднымі неінстытуцыйныя мэтады супрацьстаяньня яму.

## Пачатак крызысу "квазідэмакратычнай легітымнасьці" ў пасьлявыбарны пэрыяд і контрарэакцыя ўладаў

Менавіта ў пасьлявыбарны пэрыяд у Беларусі імкліва пачалі разгортвацца працэсы, вынікам якіх можа стаць крызыс унутранай легітымнасьці лукашэнкаўскага рэжыму. Прычынай гэтага стала вычарпаньне яго сацыяльных, эканамічных ды палітычных рэсурсаў дзеля ўтрыманьня ўзроўню грамадзкай падтрымкі на стабільна высокім узроўні. Безумоўна, працэс вычарпаньня не пачаўся 10 верасьня 2001 году. Паступовай трансфармацыі беларускага грамадзтва спрыялі натуральныя дэмаграфічныя працэсы (аснова лукашэнкаўскага электарату — гэта паджылыя людзі), і пэўная эвалюцыя палітычнай культуры, якую падштурхоўвалі працэсы сацыяльнага навучаньня (пазытыўнай ацэнкі палітычных і эканамічных альтэрнатываў беларускай мадэлі, расчараваньне ў старых ілюзіях, і, як вынік, павелічэньне адпорнасьці да афіцыйнай прапаганды), і эканамічныя працэсы ў краіне, што непазьбежна, нягледзячы на намаганьні ўлады, ламалі звыклы лад жыцьця і рабілі зварот да мінулага ўсё больш ілюзорным. Як вынік, імкліва скарачаўся жорсткі лукашэнкаўскі электарат, тое асяродзьдзе ў беларускім грамадзтве, што было арыентаванае на Лукашэнку па культурных і ідэалягічных

меркаваньнях і падтрымала б свайго лідэра ў любых абставінах. Як можна бачыць з табліцы, ужо ў 2001 годзе дэмакратычныя арыентацыі ў беларускім электараце пачыналі браць верх над аўтарытарнымі па большасьці прынцыповых пазыцый. Гэтыя тэндэнцыі ўзмацніліся пасьля пераабраньня Лукашэнкі (заўважым, што выняткам было стаўленьне да незалежнасьці/хаўруса з Расіяй, але і тут колькасьць прыхільнікаў незалежнасьці павялічылася).

**Палітычныя арыентацыі беларускага электарату**

| | Наступны прэзыдэнт павінен (лета 2001) | Дэпутат мясцовага Савету, за якога я зьбіраюся галасаваць, павінен (восень 2002) |
|---|---|---|
| Быць прыхільнікам рынкавай эканомікі | **54.0** | **67.3** |
| Быць прыхільнікам плянавай эканомікі | 24.1 | 23 |
| Быць прыхільнікам падзелу ўлады (дэмакратыі) | **41.1** | **54.2** |
| Быць прыхільнікам канцэнтрацыі ўлады ў адных руках (моцнай рукі) | 34.0 | 38.5 |
| Быць прыхільнікам незалежнасьці | **37.5** | **40.9** |
| Быць прыхільнікам саюзу з Расіяй | 44.7 | 51.5 |
| Быць прыхільнікам працягу цяперашняга курсу | 32.6 | 9.7 |
| Быць прыхільнікам радыкальнай зьмены цяперашняга курсу | **49.0** | **83** |

Крыніца: НІСЭПД.

Аднак, і колькасьць жорсткіх апанэнтаў рэжыму яшчэ не расла так хутка. Падтрымка існага рэжыму ўсё больш залежала акурат ад прагматычнай ацэнкі вынікаў дзеяньняў улады, ад яе здольнасьці захаваць "сацыяльны кантракт" з грамадзтвам. У абставінах 2000-2001 гадоў, калі беларускай эканоміцы ўсё яшчэ даводзілася пераадольваць наступствы шоку, спрычыненага жнівеньскім фінансавым крызысам у Расіі ў 1998 годзе (а фінансавая стабілізацыя, што прыйшла ў 2000 годзе, дадала праблемаў у рэальным сэкта-



ры эканомікі і ў сытуацыі з жыцьцёвымі стандартамі насельніцтва), гэта можна было зрабіць толькі кароткатэрміновымі папулісцкімі захадамі, што, аднак, непазьбежна выклікала б яшчэ большыя цяжкасьці. Акурат імкненьне выйграць выбары любой цаной і з разгромнай перавагай прымусіла Лукашэнку пайсьці на беспрэцэдэнтнае (двухразовае ў даляравым эквіваленце і 23%-нае ў рэальным) павышэньне заробкаў і пэнсіяў падчас перадвыбарнай кампаніі і паабяцаць далейшае павышэньне заробкаў да 250 даляраў у 2006 годзе.

Перадвыбарны папулізм Лукашэнкі паспрыяў росту сацыяльнага аптымізму ў беларускім грамадзтве, адрадзіла надзеі на будучыню і часова ўмацавала давер да ўлады. Як мы бачым з табліцы, надзвычай высокі працэнт беларусаў праз месяц пасьля выбараў лічыў, што краіна рухаецца ў правільным кірунку і паляпшэньне жыцьця магчыма ўжо ў найбліжэйшы час пры існай уладзе.

**Сацыяльны аптымізм беларускага грамадзтва пасьля прэзыдэнцкіх выбараў**

| | Так | Не | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|
| Краіна рухаецца ў правільным кірунку (кастрычнік 2001 году) | 38.1 | 37.6 | 25.2 |
| Краіна рухаецца ў правільным кірунку (красавік 2002 году) | 21.4 | 55.5 | 23.1 |
| Паляпшэньне эканамічнай сытуацыі магчыма пры існай уладзе | 40.7 | 39.2 | 20.1 |

Крыніца НІСЭПД http://www.iiseps.by

Захаваньне падтрымкі рэжыму Расіяй (якая кампэнсавала адсутнасьць легітымнасьці на заходнім фронце), калі да ўлады прыйшоў Уладзімер Пуцін і магчымасьці Лукашэнкі ў разыгрываньні інтэграцыйнай карты ўва ўласных інтарэсах рэзка скараціліся, патрабавала ад беларускага лідэра значных саступак Крамлю, у першую чаргу ў эканамічным пляне. Ува ўмовах, калі Беларусь знаходзілася пад шчыльным узьдзеяньнем расійскага інфармацыйна-

га поля і бальшыня яе жыхароў атрымлівала інфармацыю праз расійскія мэдыі, якраз ад стасункаў Лукашэнкі з Пуціным, які ўсталяваў амаль поўны кантроль над расійскім інфармацыйным рынкам напярэдадні передвыбарнай кампаніі ў Беларусі, залежала, на чыім баку гэтыя расійскія мэдыі будуць гуляць падчас выбараў. І калі ў першай палове 2001 году ў расійскіх мэдыях назіраліся тэндэнцыі, якія маглі вырасьці ў інфармацыйную вайну супраць беларускага прэзыдэнта (асабліва гэта было заўважна праз узьняцьце на расійскіх тэлеканалах праблемы зьніклых беларускіх палітыкаў), ужо напачатку ліпеня можна было бачыць адваротнае, а ўжо за некалькі дзён да галасаваньня сродкі масавай інфармацыі суседняй дзяржавы адкрыта гулялі на лукашэнкаўскім баку. Застаецца толькі здагадвацца, ці сапраўды Лукашэнка атрымаў падтрымку Крамля наўзамен на абяцаньні дапусьціць расійскіх алігархаў да прыватызацыі беларускай прамысловасьці. Аднак такое абяцаньне, калі б яно мела месца, стварала для беларускага лідэра цэлы шэраг праблемаў: эканамічныя пераўтварэньні ў любой форме мусілі зруйнаваць у доўгатэрміновай пэрспэктыве сацыяльныя падмуркі яго ўлады, а адмова ў прыватызацыі вяла да канкрэтнага імгненнага канфлікту з крамлёўскім кіраўніцтвам. Як паказаў наступны ход падзеяў, Лукашэнка абраў акурат другі шлях.

Нарэшце, Лукашэнка зрабіў захады для пашырэньня сваёй электаральнай базы коштам заваёвы электарату, што ня вызначыўся, г.зв. "балота", якое спавядала ўжо далёка не такія аўтарытарныя погляды, як падчас папярэдніх прэзыдэнцкіх выбараў. Ён кінуў даволі шчодрыя абяцаньні палітычнай і асабліва эканамічнай лібэралізацыі пасьля выбараў і заявіў аб сваёй прыхільнасьці да захаваньня сувэрэнітэту і незалежнасьці Беларусі. Безумоўна, невыкананьне гэтых абяцаньняў магло адштурхнуць ад Лукашэнкі даволі значную частку нявызначаных выбарцаў, што ў апошні момант прагаласавалі за яго ў верасьні 2001 году.

Такім чынам, перамога на прэзыдэнцкіх выбарах была дасягнутая Лукашэнкам шляхам мацаваньня як папулісцкіх (праз падтрымку сацыяльнага кантракту), так і султанісцкіх (праз кліенцкія стасункі з расійскімі палітычнымі і эканамічнымі элітамі) элемэнтаў сваёй улады. Аднак гэта было зроблена праз назапашваньне доўгатэрміновых забавязаньняў перад уласным грамадзтвам і яго замежнымі спонсарамі, выканаць якія ён ня здолеў. Таму асобныя элемэнты палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага падмуркаў лукашэнкаўскага рэжыму пачалі паступова разбурацца адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. А ў доўгатэрміновай пэрспэктыве гэтыя працэсы паклалі пачатак размываньня яго ўнутранай легітымнасьці.

Так, у пляне падтрыманьня сацыяльнага кантракту Лукашэнка ня толькі ня змог выканаць шчодрых сацыяльных абяцаньняў, але і мусіў назіраць за рэзкім пагаршэньнем жыцьцёвага ўзроўню ў краіне. Гэта выражалася ня толькі ў зьніжэньні рэальных даходаў насельніцтва (што, натуральна, кампэнсавала папулісцкае падвышэньне заробкаў у 2001 годзе), але і ў паступовым разбурэньні ўсёй інфраструктуры сацыяльнай абароны, крызыс якой узімку-увесну 2002 году ўжо не магла адмаўляць нават афіцыйная прапаганда. Тут варта згадаць, па-першае, зьмяненьне структуры цэнаў праз іх лібэралізацыю ці адміністрацыйнае падвышэньне. Гэта прывяло да таго, што насельніцтва пачало браць на сябе ўсё большую частку аплаты паслугаў у жыльлёва-камунальнай сфэры, а кошт прадуктаў харчаваньня пачаў перавышаць аналягічны ў -суседніх краінах. Па-другое, імкліва працягваўся працэс разбурэньня сацыяльнай сфэры: беларускім грамадзянам рабілася ўсё цяжэй атрымаць бясплатныя адукацыйныя ці мэдыцынскія паслугі. Дзеля таго што дзяржава была ўсё больш няздольная выканаць свае абавязкі перад грамадзтвам, у гэтых галінах імкліва разьвіваўся карумпаваны нефармальны рынак паслуг, з удзелу ў якім бальшыня была выключана з прычыны нізкіх даходаў. Пры гэтым не рабілася сур'ёзных спробаў прызнаць існаваньне гэтых рынкаў і забясьпечыць доступ да іх праз, напрыклад, адукацыйныя крэдыты ці мэдыцынскае страхаваньне. Па-трэцяе, рост праблемаў у рэальным сэктары прывёў да таго, што ў Беларусі ўпершыню за некалькі гадоў узнавіліся праблемы з выплатай зарплат і асабліва пэнсіяў (адсутнасьць такіх праблем доўгі час была "казырнай картай" Лукашэнкі ў адстойваньні мэтазгоднасьці яго эканамічнага і палітычнага курсаў). Нарэшце, улада антаганізавала значную частку гра-

мадзтва пасьля таго, як практыка пабораў для фінансаваньня буйных інвэстыцыйных праектаў — такіх, як рэканструяваньне Плошчы Незалежнасьці ды акружной аўтадарогі ў Менску і асабліва пабудова Нацыянальнай бібліятэкі — стала ўжывацца надзвычай шырока. Зазначым, што ад усіх гэтых нэгатыўных зьяваў цярпелі ў першую чаргу тыя слаі насельніцтва, што цягам усяго тэрміну лукашэнкаўскага панаваньня складалі аснову яго сацыяльнай базы.

Наступным чыньнікам, што даў пачатак крызысу ўнутранай легітымнасьці лукашэнкаўскага рэжыму, стала абвастрэньне канфлікту Лукашэнкі з расійскім кіраўніцтвам у 2002 годзе. Нагадаем, што саюз з Расіяй доўгі час быў бадай што галоўнай заяўленай мэтай беларускага прэзыдэнта, абгрунтаваньнем самога палітычнага рэжыму, увасабленьнем яго мэсіянскай місіі. Зь іншага боку, пэрспэктыва аб'яднаньня з усходнім суседам, захаваньне бесьперашкоднага доступу да яго рынку і танных сыравінавых рэсурсаў давала грамадзтву адказ на пытаньне, якім чынам беларускія ўлады здолеюць захаваць палітычную і эканамічную стабільнасьць ува ўмовах імкліва зьменлівага сьвету. Такім чынам, курс на саюз з Расіяй быў і працягам лукашэнкаўскай унутранай палітыкі "сацыяльнага кантракту". Але ж ён (таксама як і ўладныя амбіцыі самога Лукашэнкі) дыктаваў толькі адну магчымую мадэль саюзу — канфэдэрацыю дзьвюх сувэрэнных дзяржаваў, лепш за ўсё з Лукашэнкам у якасьці кіраўніка. Паколькі ідэя саюзу зь Беларусьсю выкарыстоўвалася Крамлём яшчэ за часоў Ельцына для ўмацаваньня свайго становішча на расійскай палітычнай сцэне, Лукашэнка меў магчымасьць весьці свае інтэграцыйныя гульні ў гэтым кірунку, атрымоўваючы пры гэтым рэальныя эканамічныя рэсурсы для свайго рэжыму. Становішча зьмянілася з прыходам да ўлады Ўладзімера Пуціна, для якога Лукашэнка рабіўся ўсё большай дакукай як у эканамічным, так і ў замежнапалітычным пляне, асабліва пасьля 11 верасьня 2001 году. Апрача таго Лукашэнка не сьпяшаўся выканаць абяцаньні, дадзеныя расійскім бізнэс-групам падчас прэзыдэнцкай кампаніі, а замест гэтага толькі расшырыў сьпіс патрабаваньняў па эканамічным субсыдыяваньні Беларусі. Адказам Пуціна на "незгаворлівасьць" свайго беларускага калегі была



імклівая інфармацыйная атака. У чэрвені 2002 году ён упершыню адкрыта выказаў незадавальненьне лукашэнкаўскай вэрсіяй саюзу і заклікаў аддзяліць працэс расійска-беларускай інтэграцыі ад задавальненьня палітычных амбіцыяў самога Лукашэнкі. У жніўні з вуснаў Пуціна ўпершыню прагучала прапанова аб далучэньні Беларусі да Расійскай Фэдэрацыі ў якасьці шасьцёх суб'ектаў. Нарэшце, канфлікт паміж беларускім урадам і найбуйнейшай расійскай дзяржаўнай манаполіяй "Газпром" у лістападзе прывёў да скарачэньня паставак расійскага газу на Беларусь, а потым — і да падвышэньня цэнаў на яго. Такім чынам, ужо Расія пачынала атакаваць Лукашэнку за яго нежаданьне аб'яднацца праз нязгоду на вырыянт інкарпарацыі. Лукашэнка ў гэтай сытуацыі быў ня ў выйгранкавым становішчы. Па-першае, ён мусіў супрацьстаяць апанэнту са значным палітычным, эканамічным і інфармацыйным уплывам на Беларусь. Па-другое, Пуцін у некалькі разоў апярэджваў Лукашэнку па папулярнасьці ў самой Беларусі, што аўтаматычна надавала двухбаковаму канфлікту рысы ўнутрыпалітычнага крызысу ўлады. А паколькі якраз папулярнасьць Пуціна ў Беларусі спрыяла росту інтэграцыйных настрояў у грамадзтве ў 2000-2001 гадох, некаторыя аналітыкі прадказвалі няздольнасьць Лукашэнкі справіцца з гэтым крызысам, бо ён, маўляў, няздольны да палітычнай гульні на "незалежніцкім" полі. Аднак, абараняючыся ад эканамічнай ды інфармацыйнай атакі з боку Крамля, Лукашэнка аднавіў прапаганду ідэяў незалежнасьці і сувэрэнітэту ў беларускім грамадзтве. Акурат у гэты пэрыяд у афіцыйны палітычны лексыкон увайшлі такія выразы, як "сувэрэнітэт не прадаецца", "крамлёўскі палітычны снабізм" і нават "імпэрскія амбіцыі". У выніку прапагандысцкай контраатакі лукашэнкаўскі рэжым дастаткова пасьпяхова згуляў на нацыянальных пачуцьцях беларусаў, карыстаючыя досыць бесцырымонным тонам асьвятленьня крызысу ў беларуска-расійскіх стасунках у расійскай прэсе. Літаральна за некалькі месяцаў узровень падтрымкі незалежнасьці амаль вярнуўся да паказьнікаў 1998-1999 гадоў. Больш за тое, Лукашэнка пасьпяхова пазыцыянаваў сябе як гаранта сувэрэнітэту, што дапамагло яму прыпыніць падзеньне ўласнага рэйтынгу коштам зда-

быцьця падтрымкі ў часткі "незалежнікаў". Аднак у доўга- і нават сярэднетэрміновай пэрспэктыве канфлікт з Пуціным стварыў шэраг праблемаў для палітычнага рэжыму ў Менску, паколькі пазбавіўся прэтэнзіяў на мэсіянства — сваёй галоўнай ідэялягічнай зброі. Замест гэтага рэжым мусіў часткова рэабілітаваць ідэялягічны дыскурс сваіх заўзятых апанэнтаў. Лукашэнка мусіў зрабіць больш выразны выбар паміж Расіяй і незалежнасьцю і такім чынам пазбавіць грамадзтва ілюзіі, што гэтыя два станы ўдасца сумясьціць. У выпадку, калі Лукашэнка робіць выбар на карысьць незалежнасьці, ён павінен перабудаваць эканамічную сыстэму краіны, каб прыстасаваць яе да існаваньня без расійскай падтрымкі, што азначае распачацьце рэформаў, якіх ён доўга пазьбягаў. У кароткатэрміновай пэрспэктыве гэта толькі абвострыць вышэйадзначаныя нэгатыўныя сацыяльныя тэндэнцыі ды прывядзе да далейшага зьніжэньня ўзроўню падтрымкі ўлады ў грамадзтве. Пры гэтым ён ня зможа разьлічваць на палітычную падтрымку Крамля ў магчымым рэфэрэндуме аб працягу сваіх прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў. Курс на інтэграцыю па правілах Крамля вядзе да аўтаматычнай страты Лукашэнкам мэханізмаў улады. Малаверагодна, што ў гэтых рамках можа быць выпрацаваны нейкі зьмястоўны кампраміс, што захаваў бы статус кво канца 1990-х гадоў.

Сутыкнуўшыся з крызысам папулярнасьці, Лукашэнка зрабіў захады па "ўтрымліваньні" грамадзтва шэрагам традыцыйных для сябе крокаў, якія падкрэсьлівалі яго папулісцкі стыль палітычнага лідэрства. Так, адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у краіне распачалася новая антыкарупцыйная кампанія, ахвярамі якой сталі некалькі высокіх пасадовых асобаў і кіраўнікоў буйных дзяржаўных прадпрыемстваў (сярод найболей вядомых — начальнік Беларускай чыгункі, сябра Рады рэспублікі Нацыянальнага Сходу Віктар Рахманько, дырэктар Менскага трактарнага заводу Міхаіл Лявонаў ды дырэктар менскага заводу лядоўняў "Атлант" Леанід Калугін). Пад пагрозай знаходзіліся і іншыя чыноўнікі. Падчас паседжаньня ўраду ў красавіку 2002 году проста ў тэлевізійным этэры быў звольнены з пасады міністар аховы здароўя Ўладзіслаў Астапенка, а астатнія сябры ўраду былі папярэджаны аб пэрсанальнай адказнасьці за невыкананьне "прагнозных паказьнікаў сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця краіны" (фактычна - передвыбарных абяцанак самога Лукашэнкі). Новая кампанія распачалася і супраць прыватных прадпрымальнікаў, якія сутыкнуліся з шэрагам рэпрэсіўных захадаў фінансавага характару. У грамадзкай сфэры Лукашэнка імкліва дамагаўся падтрымкі праваслаўнай царквы, дзеля чаго новы закон аб рэлігіі, прыняты Нацыянальным Сходам і падпісаны прэзыдэнтам у кастрычніку 2002 году, значна абмежаваў правы г. зв. "нетрадыцыйных канфэсіяў" (у першую чаргу - пратэстанцтва, уніяцтва, незалежных ад расійскага патрыярхату праваслаўных царкваў ды асобных нехрысьціянскіх канфэсіяў). Такім чынам, у масавую сьвядомасьць зноў насаджаўся традыцыйны імідж "ворага" (прыватны бізнэс, карумпаваная бюракратыя, апазыцыя, сэктанты, агенты заходняга ўплыву). Аднак усе гэтыя захады ацэньваліся адмоўна як мінімум удвая большай часткай насельніцтва за тых, хто падтрымліваў гэтыя дзеяньні Лукашэнкі. Такім чынам, спробы аднавіць свой папулісцкі імідж, мацаваць палітычныя пазыцыі шляхам выяўленьня ды зьнішчэньня "ворагаў" ужо гублялі эфэктыўнасьць у якасьці інструмэнту прэзыдэнцкай піяр-кампаніі.



У гэтых умовах асноўным сродкам узмацненьня палітычнага рэжыму стала ўдасканаленьне яго султаністцкіх элемэнтаў, рэпрэсіўных мэханізмаў, якія мелі кампэнсаваць як паступовую страту "квазідэмакратычнай легітымнасьці" ў якасьці гаранта сацыяльнага статус-кво, так і магчымае зьмяншэньне ролі расійскага патранажу як яго вонкавай апоры.

Так, Лукашэнкам былі зробленыя тэрміновыя захады па ўнутранай кансалідацыі палітычнага рэжыму. Адразу пасьля выбараў адбылася чыстка вышэйшых эшалёнаў уладнага апарату, у ходзе якой пазбавіліся пасадаў некалькі найбольш уплывовых прадстаўнікоў дзяржаўнай бюракратыі, якія тэарэтычна маглі павесьці ўласную закулісную гульню супраць Лукашэнкі. Імі былі перш за ўсё былыя прэм'ер-міністар краіны Ўладзімер Ярмошын і кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі Міхаіл Мясьніковіч (нагадаем, што акурат іх Лукашэнка ўскосна абвінаваціў у спробах вядзеньня неза-

лежнай палітычнай гульні за месяц да прэзыдэнцкіх выбараў). Вышэйшыя пасады ўсё больш запаўняліся з шэрагаў "землякоў" прэзыдэнта і прадстаўнікоў сілавых структураў, чыя ляяльнасьць выклікала мала сумневаў.

У дачыненьнях з грамадзтвам улады старанна абмяжоўвалі ці нават вынішчалі рэальна існыя ці патэнцыйныя зоны аўтаноміі ад простага дзяржаўнага ўплыву, што маглі быць скарыстаныя палітычнай апазыцыяй ці грамадзянскай супольнасьцю дзеля арганізацыі супраціўвагі рэпрэсіўнаму апарату. Пад новыя рэпрэсіі падпала незалежная прэса: у 2002 годзе некалькі журналістаў апазыцыйных выданьняў былі асуджаныя за паклёпы на прэзыдэнта. Шэраг незалежных газэтаў ("Пагоня", "Новая Газэта Смургоняў") былі зачыненыя. Распачаты пасьля прэзыдэнцкай кампаніі працэс "адзяржаўліваньня" Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларускай быў завершаны ў ліпені прызначэньнем на пасаду яе старшыні намесьніка кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі Леаніда Козіка. Такія працэсы адбыліся і ў моладзевым руху, вынікам чаго стала стварэньне новай прапрэзыдэнцкай арганізацыі "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі".

Нарэшце трэба адзначыць і шэраг захадаў з боку ўлады, накіраваных на самаізаляцыю Беларусі ў палітычным і інфармацыйным аспэктах. Да іх можна аднесьці як абмежаваньне кантактаў эўрапейскіх арганізацыяў і міжнароднай грамадзянскай супольнасьці зь беларускай грамадзкасьцю (выцісканьне місіі АБСЭ зь Беларусі і прыпыненьне праграмаў TACIC у краіне), так і манапалізацыю інфармацыйнай прасторы дзяржавы афіцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі праз выцісканьне зь яе расійскіх электронных мэдыяў (гл. больш падрабязна пр гэта ў артыкуле Андрэя Екадумава "Палітыка беларускіх уладаў на інфармацыйным рынку. Верасень 2001- Сакавік 2003").

У цэлым палітычны кантэкст канца 2001-га — пачатку 2003 году можна ахарактарызаваць як паралельны працэс размываньня сацыяльных і ўзмацненьня рэпрэсіўных падмуркаў лукашэнкаўскага рэжыму. Гэтыя паралельныя тэндэнцыі супярэчаць адна адной, але такая супярэчлівасьць не зьяўляецца парадаксальнай, калі другую разглядаць у якасьці адказу на выклікі першай.



## Высновы

Палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя працэсы, што разгарнуліся ў пасьлявыбарны пэрыяд, вялі да разбурэньня трывалых амаль дзесяцігодзьдзе ідэалягічных, прагматычных і эмацыйных сувязяў паміж палітычным лідэрам і яго прыхільнікамі ў грамадзтве. Узрослая незадаволенасьць уладай паспрыяла рэзкаму падзеньню рэйтынгу Лукашэнкі, які цягам 2002 году зьнізіўся да рэкордна нізкай адзнакі за ўсе гады яго прэзыдэнцтва. Адзначым дзьве істотныя акалічнасьці гэтага падзеньня: у параўнаньні зь першымі месяцамі прэзыдэнцтва Лукашэнкі (калі ягоны рэйтынг таксама ўпаў да падобнай адзнакі), былыя прыхільнікі прэзыдэнта пераходзілі ўжо не ў "балота", а ў жорсткі антыпрэзыдэнцкі электарат, які ўпершыню наблізіўся да адзнакі 50% і такім чынам павялічыўся за пяць год амаль у два з паловай разы.

Другое, у параўнаньні з пачаткам 1990-х гадоў, калі эканамічны крызыс выклікаў усплёск незадаволенасьці ўладай, што і прывяло да перамогі Лукашэнкі ў 1994 годзе, эканамічныя цяжкасьці на гэты раз спрыялі пераасэнсаваньню палітычных вартасьцяў у грамадзтве,




Крыніца: НІСЭПД.

дадавалі маўкліваму сацыяльнаму пратэсту ўсё большую ідэалягічную афарбаванасьць. У грамадзтве рэзка павялічылася колькасьць прыхільнікаў ня проста ідэі пераменаў, але пераменаў у кірунку дэмакратычных і рынкавых пераўтварэньняў (нагадаем, дзесяцігодзьдзе таму эканамічны крызыс вёў да росту настальгіі за савецкімі часамі і пашырэньню кансэрватыўных ды рэакцыйных настрояў у грамадзтве). Такое пераасэнсаваньне вартасьцяў спрычыніла расчараваньне ня проста ў магчымасьцях і здольнасьцях самаго Лукашэнкі выканаць абавязаньні перад грамадзтвам, але і ў сыстэме, якой ён кіруе, што падштурхоўвала выбарцаў да ўсьведамленьня палітычных ды сацыяльных альтэрнатываў існаму стану рэчаў.

У той жа час, пакуль што можна казаць толькі аб пачатку крызысу ўнутранай легітымнасьці рэжыму, а не аб яго паўнавартасным разгарненьні. Балянс сацыяльных сілаў хоць і пераважыў на карысьць дэмакратыі і рэформаў, яшчэ не зьмяніўся да такой ступені, каб зрабіць палітычныя перамены непазьбежнымі. Але ж зьмена вартасных арыентацыяў у грамадзтве ня значыла, што паралельна адбываўся рост сацыяльнай мабілізацыі: грамадзтва яшчэ ня вычарпала ўсіх рэсурсаў прыстасаваньня да эканамічных цяжкасьцяў, каб нарастаньне супярэчаньняў паміж ім і ўладай вырасла ў сацыяльны выбух. Іншымі словамі, з трох крытэраў "рэвалюцыйнай сытуацыі", вызначаных у свой час Уладзімерам Леніным — нізы не жадаюць жыць па-старому; вярхі не могуць па-старому кіраваць; рост актыўнасьці нізоў — апошні адсутнічаў. Адзінай прыкметай адваротнай тэндэнцыі былі страйкі дробных прадпрымальнікаў, што адбыліся ў верасьні-кастрычніку 2002 году, якія, аднак, не атрымалі моцнага грамадзкага рэзанансу. Аднак, важнасьць працэсаў, якія распачаліся ў беларускім грамадзтве ў 2001-2002 гадох, — у тым, што яны могуць аказацца незваротнымі. У гэтым выпадку яны закладаюць падмуркі для зьмены палітычнага рэжыму ўжо ў агляднай пэрспэктыве.

[1] H.E. Chelabi and Juan J. Linz, eds. *Sultanistic Regimes.* Baltimore and London: The Johns Hopkins University Press, 1998, p.7.